ПАЛАЖЭННЕ
аб конкурсе прафесійнага майстэрства
на лепшы бібліяграфічны дапаможнік,
прысвечаны пісьменнікам-юбілярам 2021 года

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Конкурс арганізоўваецца ў рамках правядзення юбілейных мерапрыемстваў, прысвечаных беларускім пісьменнікам-юбілярам 2021 года.

1. 2. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца:

- ✓ дзяржаўная ўстанова культуры «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна» (далей – установа);
- ✓ прафсаюзны камітэт першаснай прафсаюзнай арганізацыі ўстановы.

**2. Мэты і задачы конкурсу**

папулярызацыя творчасці беларускіх пісьменнікаў-юбіляраў 2021 года;

стымуляванне інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкараў сістэмы;

выяўленне інавацыйных форм работы ў галіне стварэння бібліяграфічнай прадукцыі;

стымуляванне прафесійнага майстэрства і творчых магчымасцей бібліятэкараў.

**3. Патрабаванні да конкурсных работ**

Да конкурсу дапускаюцца друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі розных форм: паказальнікі, дайджэсты, спісы літаратуры, серыі кніжных закладак (ад 3 да 5 штук), буклеты і інш.

Матэрыялы, якія прадстаўляюцца на конкурс, павінны адказваць наступным патрабаванням:

адпаведнасць тэме конкурсу;

індывідуальны творчы стыль;

адпаведнасць ДАСТ 7.1-2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы складання»;

прытрымлівацца рэкамендацый па складанні дапаможнікаў;

інавацыйныя прыёмы выканання.

Бібліяграфічны дапаможнік павінен суправаджацца тлумачальнай запіскай аб’ёмам не больш за 1 старонку друкаванага тэксту, у якой неабходна пазначыць: мэта стварэння бібліяграфічнага дапаможніка, чытацкае прызначэнне.

**4. Парадак правядзення конкурсу**

У конкурсе могуць прымаць удзел бібліятэкары не залежна ад стажу работы і кваліфікацыйнай катэгорыі.

Конкурсныя работы прымаюцца не пазней за 15 жніўня 2021 года па адрасу: ГУК «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна», вул. Пралетарская, 82, г. Мазыр (аддзел бібліятэчнага маркетынгу).

Вынікі конкурсу падводзяцца прафесійным журы (дадатак 1) да 15 верасня 2021 года.

**5. Вынікі конкурсу і ўзнагароджанне пераможцаў**

Пераможцы конкурсу размяркоўваюцца на тры прызавых месцы:

1 месца - грамата і грашовая прэмія ў памеры двух базавых велічынь з пазабюджэтных сродкаў установы;

2 месца - грамата і грашовая прэмія ў памеры паўтары базавых велічынь з пазабюджэтных сродкаў установы;

3 месца - грамата і грашовая прэмія ў памеры адной базавай велічыні ад прафсаюзнага камітэта першаснай прафсаюзнай арганізацыі ўстановы

УЗГОДНЕНА:
Старшыня прафсаюзнага камітэта
дзяржаўнай установы культуры
«Мазырская цэнтральная раённая
бібліятэка імя А.С.Пушкіна»
А.В.Кузоўкіна

________________2021

Дадатак №1

**Склад журы**

| | |
|---|---|
| Старшыня журы | дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна»<br>Мазуркевіч Алёна Міхайлаўна |
| Сакратар журы | метадыст I катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу дзяржаўнай установы культуры «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна»<br>Сень Галіна Васільеўна |
| Члены журы | 1. загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна»<br>Кір'янава Людміла Рыгораўна<br>2. старшыня першаснага прафсаюзнага камітэта ДУК «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна»<br>Кузоўкніа Аксана Віктараўна<br>3. намеснік дырэктара ДУК «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна»<br>Кухарава Ганна Уладзіміраўна |